# Візавая інфармацыя і іміграцыйная палітыка для ахвяр сэксуальнага і асобіснага гвалту

Замежным студэнтам і стыпендыятам, якія маюць пытанні па іміграцыйнай і візавай палітыке, мы раім звярнуцца да юрыста, які займаецца пытаннямі іміграцыі. У гэтым дакуменце апісаны толькі некаторыя аспекты міграцыйнага заканадаўства, таму гэты дакумент не замяняе юрыдычнай парады.

**Ці паўплывае мой міграцыйны статус на атрыманне доступу да рэсурсаў на тэрыторыі кампусу, калі я стаў (стала) ахвярай гвалту?**

Не. Студэнты і супрацоўнікі, якія сталі ахварямі сэксуальнага ці асобіснага гвалту, маюць тыя ж правы, што і асобы,названыя ў Пункце IX Паправак да Кодэксу аб Адукацыі ад 1972 году (Пункт IX)) і Законе аб Гвалце Супраць Жанчын (VAWA), незалежна ад іх іміграцыйнага статусу і наяўнасці ў іх візы.

Інфармацыю аб наяўных у кампусе медыцынскіх і псіхатэрапеўтычных паслугах, а таксама аб магчымасцях пражывання, можна атрымаць на сайце: https://1is2many.okstate.edu/

Інфармацыю аб правядзенні судовых разбораў у адносінах да студэнтаў можна атрымаць на сайце: https://studentconduct.okstate.edu/code

Каледж не будзе прымаць супраць Вас аніякіх адказных дзеянняў ці змяняць стаўленне да Вас выключна на выснове таго, што Вы паведамілі аб правапарушэнні.

**Ці магу я прад'явіць абвінавачанне, калі я з'яўляюся легальным ці нелегальным імігрантам?**

Так. Больш падрабязную інфармацыю аб крымінальным азначэнні сэксуальнага гвалту, хатняга гвалту, гвалту на спадканнях ці псіхалагічнага гвалту на тэрыторыі Вашага Штату Вы можаце знайсьці ў Штогадовай Справаздачы па Бяспецы: https://police.okstate.edu/annual-security-reports

Для вырашэння канкрэтных пытанняў аб прад'яўленні абвінавачанняў звярніцеся да:

Oklahoma State University Police Department, OSUPD
104 USDA Building, Stillwater, Oklahoma 74078
405-564-6523
https://police.okstate.edu/
1is2many@okstate.edu

**Ці ёсць магчымасці атрымаць візу ахвяре злачынства?**

Так. Ахвяры сэксуальнага ці хатняга гвалту, гвалту на спадканнях ці псіхалагічнага гвалту могуць прэтэндаваць на атрыманне візы, уключаючы, амаль іншых варыянтаў, візы тыпу U і T. Калі ласка, звярніцеся да юрысту, які спецыялізуецца на пытаннях іміграцыі.

| Віза U | Віза T |
|---|---|
| Для ахвяр істотнага фізічнага ці псіхалагічнага гвалту, які быў вынікам супрацьпраўных дзеянняў, уключаючы сэксуальны ці хатні гвалт, згвалтаванне, напад ці іншыя падобныя правапарушэнні.<br>- Асоба, якая хадатайнічае аб атрыманні візы, павінна быць ахвярай злачынства, якое трапляе пад умовы атрымання гэтага тыпу візы, а іх удзел у расследаванні і/ці судовам праследаванні ў межах гэтай справы павінен быць карысным для правасуддзя.<br>- Стандартны тэрмін дзеяння візы - 4 гады.<br>- Звярніцеся да юрысту, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі.<br>Больш падрабязную інфармацыю Вы таксама можаце знайсьці на сайце: | Для ахвяр гандлю людзьмі<br>-Асоба, якая хадатайнічае аб атрыманні візы, павінна ў разумных межах супрацоўнічаць з праваахоўчымі органамі пры расследаванне і судовам праследаванні асоб, якія абвінавачваюцца ў гандлі людзьмі (за выключэннем тых выпадкаў, калі ахвяра гандлю людзьмі не можа ўдзельнічаць у расследаванні з-за фізічнай ці псіхалагічнай траўмы), а таксама даказаць, што ахвяра (асоба, якая хадатайнічае аб атрыманні візы) будзе сур'ёзна пакутаваць у выпадку дэпартацыі са Злучаных Штатаў Амерыкі.<br>- Стандартны тэрмін дзеяння візы - 4 гады.<br>- Звярніцеся да юрысту, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі.<br>Больш падрабязную інфармацыю Вы таксама можаце знайсьці на сайце: |
| http://www.uscis.gov/humanitarian/victims-human-trafficking-other-crimes/victims-criminal-activity-u-nonimmigrant-status/victims-criminal-activity-u-nonimmigrant-status | http://www.uscis.gov/humanitarian/victims-human-trafficking-other-crimes/victims-human-trafficking-t-nonimmigrant-status |

**Ці ёсць у кампусе аддзел, дзе можна атрымаць дадатковую інфармацыю?**

, International Students & Scholars
250 Student Union, Stillwater, OK 74078
405-744-5459
https://lcl.okstate.edu/iss/

su-iss@okstate.edu

Аддзел абслугоўвання замежных студэнтаў і стыпендыятаў дае карысную інфармацыю па пытаннях іміграцыйнага статусу. Каб атрымаць кансультацыі па візавых пытаннях і юрыдычных нюансах, не звязаных са стандартнымі візамі тыпу F-1 и J-1, ці атрыманню працоўных віз, якія фінансуе наймальнік, звярніцеся да юрысту-спецыялісту па іміграцыйных пытаннях.

| **Варыянты атрымання візы** | |
|---|---|
| Студэнцкая віза: F-1 и J-1<br>• Магчымасць выбраць больш павольную навучальную нагрузку па стану здароўя на падставе даведкі ад кваліфікаванага лечачага ўрача, ўрача-астэапату ці кваліфікаванага псіхолага<br>• Магчымасць перапыніць свой удзел у навучальнай праграме і вынікі гэтага кроку<br>• Інфармацыя аб далейшым аднаўленні ўдзелу ў навучальнай праграме, калі студэнт прымае рашэнне перапыніць свой удзел у ёй<br>• Магчымасць атрымаць візу для мужа/ жонкі студэнта<br>• Агульная інфармацыя аб магчымасці змены візавага статусу<br>• Агульная інфармацыя аб візах тыпу U і T. (Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі)<br>• Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту | H-1B, O-1, E-3 ці супрацоўнікі TN<br>• Магчымасць узяць трудавы адпачынак і уплыў гэтага рашэння на іміграцыйны статус супрацоўніка<br>• Магчымасць атрымання візы і іх вынікі для мужа/ жонкі<br>• Агульная інфармацыя аб магчымасці змены візавага статусу. Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі<br>• Агульная інфармацыя аб візах тыпу U і T. (Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі)<br>• Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту.<br>• Жыхары ЗША, якія чакаюць сцвярджэння статусу пастаяннага рэзідэнту (у тым выпадку, калі грын-карта яшчэ не была сцверджана)<br>• Уплыў звальнення с цяперашняга месца працы на Ваш несцверджаны статус пастаяннага рэзідэнту, переезд якога фінансуецца наймальнікам;<br>• Рэкамендацыя кваліфікаванага юрысту |

**Як можа дапамагчы юрыст, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі?**

Юрысты, якія займаюцца іміграцыйнымі пытаннямі, маюць ліцэнзію на ажыццяўленне адвакацкай дзейнасці ў сферы іміграцыйнага права. Яны представляюць кліентаў на перамовах з органамі іміграцыі, у тым ліку ў іміграцыйных судах і пры падачы заявы на іміграцыйныя ільготы. Юрыст можа даць агульную інфармацыю і больш падрабязна азнаёміць Вас з даступнымі Вам варыянтамі іміграцыі. Як і ўсе іншыя прадстаўнікі юрыспрудэнцыі, яны павінны прытрымлівацца патрабаванняў закону і прафесійнай этыкі, таму ўсе перамовы з кліентамі застаюцца канфідэнцыяльнымі.

**Дзе я магу знайсьці бліжэйшага да мяне юрыста, які займаецца іміграцыйнымі пытаннямі?**

Служба Грамадзянства і Іміграцыі ЗША (USCIS), бюро Міністэрства ўнутраннай бяспекі (DHS), мае два вэб-сайта, на якіх можна знайсьці інфармацыю аб бясплатных ці недарагіх юрыдычных паслугах:

USCIS: Куды звярнуцца за дапамогай у сваёй мясціне

USCIS: Пошук юрыдычнай дапамогі

Савет па разгляду заяў аб іміграцыі дае інфармацыю аб юрыстах (BIA), якія аказваюць кансультацыйныя паслугі па іміграцыйных пытаннях у розных штатах бясплатна альбо за невялікае узнагароджанне.

Амерыканская Асацыяцыя Юрыстаў, якія займаюцца іміграцыйнымі пытаннямі (AILA), аказваюць паслугу па парадзе юрыстаў, дзякуючы якой студэнты ці стыпендыяты могуць знайсьці падыходзячага да іх спецыяліста.

На сайце Амерыканскай Асацыяцыі Юрыстаў таксама можна знайсьці інфармацыю аб юрыдычных паслугах па кожнаму штату.